ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1979 г.
6 СНЕЖНЯ
ЧАЦВЕР
№ 35 (1261)

Цана 2 кап.

# НАВІНЫ БДУ

## Адкрыўся музей

у навукова-даследчым інстытуце прыкладных фізічных праблем пры Белдзяржуніверсітэце, прысвечаны памяці акадэмікаў А. Н. Сеўчанкі і Л. В. Валадзько.

Работу па арганізацыі музея, распрацоўку плана, канструкцыі стэндаў, збор матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці вядомых вучоных здзейсніла камісія, у састаў якой увайшлі супрацоўнікі інстытута Я. Варапай, М. Ксенафонтаў, А. Мінько, Ф. Сеўчанка.

У музеі прадстаўлена толькі невялікая частка сабраных экспанатаў. Зараз вядзецца работа па расшырэнню экспазіцыі.

А. ЦЫКУНОЎ,
старшыня штаба «КП» НДІ ПФП.

## Якім быць

чалавеку будучага? Што такое выхаванасць, хто больш сучасны — рацыяналіст XX века ці Дон-Кіхот? Такія і іншыя праблемы абмяркоўваліся на дыспуце, які нядаўна праводзіўся бібліятэкай універсітэта для другакурснікаў геафака. З вялікай цікавасцю гаварылі студэнты аб культуры паводзін, выказвалі свае думкі і погляды па хвалюючых пытаннях этыкету. Абыякавых не было. І ў галоўным усе засталіся адзіныя: ідэал грамадства, якое будуе камунізм, — усебакова развітая асоба, чалавек адукаваны, духоўна і фізічна развіты.

Н. КАВЕРЫНСКАЯ,
метадыст бібліятэкі.

## Аднавіла работу

школа юнага карэспандэнта, якая была арганізавана пры факультэце журналістыкі.

Новы набор склаў пяцьдзесят чалавек. Гэта — мінскія школьнікі, якія жадаюць звязаць свой далейшы лёс з журналістыкай, прадоўжыць навучанне ў сценах Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Тут, на факультэце журналістыкі, ужо займаюцца былыя слухачы школы юнкораў, цяперашнія першакурснікі І. Гамонаў, В. Дашук, А. Новікава. Вучоба ў школе дала ім шмат карыснага і цікавага.

Выкладчыкамі школы з'яўляюцца студэнты факультэта журналістыкі. Захапляючыя, напоўненыя фактычным матэрыялам і яркімі прыкладамі лекцыі чытаюць П. Васючэнка, М. Мінакова, С. Лыскавец і іншыя.

Сёлета вырашана значна павялічыць праграму навучання, аддаць больш увагі практычнай рабоце.

А. ПАДАРОЖНАЯ,
юнкор.

ЛЕНІНСКІ СТЫПЕНДЫЯТ

# САМЫ ВЯЛІКІ ПРАКТЫКУМ

ГЭТА лабараторыя падобна на іншыя, якіх шмат на біялагічным факультэце. Тыя ж сталы з living рознакалібернымі колбамі і мудрагелістымі рэтортамі, у якіх кіпелі ці знаходзіліся ўсялякія вадкасці і рэчывы. І гэты своеасаблівы пах, які напаўняў пакой (ды і ўвесь корпус), нягучныя, дзелавыя размовы студэнтаў гаварылі аб тым, што тут ідуць доследы. І сапраўды, у 625-м пакоі ў студэнтаў чацвёртага курса быў вялікі спецпрактыкум.

— «Баню» трэба рабіць, а падставак пад прабіркі няма.

— Рукой трымай.

— А колькі хвілін?

— Дваццаць.

— Галава! Гэтулькі часу ды пры ста градусах... Але пачакай.

Іра Пікулева паспрабавала ваду ў «бані» пальцам і з упэўненасцю сказала:

— Ды тут і трыццаці няма. Пакуль нагрэецца...

Але іменна гэтыя дваццаць мінут былі тым часам, які Ірына магла выдзеліць карэспандэнту, што тоўкся то каля выцяжнога шкафа, то каля электрычнай пліткі, сваёй прысутнасцю мала садзейнічаючы паспяховаму правядзенню доследаў.

— А чым у гэты час вы займаецеся?

Гэта было маё першае пытанне да ленінскай стыпендыяткі Ірыны Пікулевай.

Яна вачыма ўсміхнулася. Вельмі ветліва. І адказала. Я зразумеў. Работа Пікулевай, як і яе аднакурснікаў, неабходная, не даруе безадказных да яе адносін. Трэба быць фанатыкам (у добрым сэнсе гэтага слова), каб так самааддана прысвячаць сябе працы. Элементарны разлік. Заняткі заканчваюцца ў палове чацвёртага.

— А мой самы кароткі дослед працягваецца каля шасці гадзін,—гэта гаворыць Ірына.

Значыць, студэнт можа быць свабодным дзесьці каля дзесяці гадзін вечара. Сапраўды, нагрузка немалая.

— Затое вельмі цікава, што ж атрымаецца ў выніку, — зноў сцвярджае сваю думку студэнтка.

Вядома, цікава. А як быць з заўтрашнімі заняткамі? Да іх трэба таксама рыхтавацца, схадзіць у бібліятэку, прачытаць канспекты. Нарэшце, наведванне тэатраў, кіно яшчэ ніколі не прыносіла шкоды студэнтам.

— Вялікі спецпрактыкум не кожны дзень.

— А чаму ён называецца вялікім?

— Забірае больш за ўсё часу, таму і вялікі...

Ірына засмяялася і нечакана выпусціла з рук адну з прабірак.

— Ай, сэрца вылілася ў «баню».

Зразумела, чаму такая роспач чулася ў яе голасе. Дослед завяршаўся. А цяпер? Відаць, прыйдзецца пачынаць усё спачатку? І што ж гэта за сэрца, якое «вылілася»? Ды звычайнае паддоследнае пацуковае сэрца. Карацей кажучы, тое, што з яго засталося пасля складаных хімічных і фізічных пераўтварэнняў у розных сасудах.

Заставалася толькі працэнтрыфугаваць рэчывы з гэтымі прабіркамі. Але, як сказала Ірына, ёй пашанцавала. У прабірцы крыху заставалася вадкасці.

— Іна, колькі часу круціць?

Не адрываючыся ад канспекта, сяброўка Пікулевай адказвае:

— Дваццаць хвілін пры 5000 абаротаў.

— Дык тут жа толькі 3 тысячы.

— Значыць, пры трох...

Цэнтрыфуга ўключана.

І зноў Ірына на працягу дваццаці мінут можа расказваць пра сябе.

Школу закончыла з залатым медалём. Хімія і біялогія былі самымі любімымі прадметамі. Не выпадкова быў і выбар факультэта ва універсітэце — біялагічны. Пачаліся студэнцкія будні.

Ірына выдатна вучылася, паспявала актыўна ўдзельнічаць у грамадскай рабоце. Як на ўсё знайсці час?

— У нас на 1—3 курсах у асноўным былі лекцыі.

— А сумяшчаць іх з лабараторнымі заняткамі немагчыма?

— Чаму не? Можна. Але я не бачу сэнсу. Могуць быць палавінчатыя веды і па тэорыі, і па практыцы. А гэта мяне не задавальняе.

Цэнтрыфуга спынілася. Засталося толькі праверыць вынікі доследу на спектрафатометры. Практыкум працягваўся. Праз некаторы час ён закончыцца.

Але другі практыкум — самы вялікі — ніколі не закончыцца. Бо назва яму — жыццё:

— Ці не так, Ірына?

Яна крыху падумала. Паціснула плячыма.

— Так. Можа быць...

М. ДУБОВІК.
Фота аўтара.



# Ганаровая ўзнагарода

ДАЎНЯЯ і моцная дружба звязвае студэнтаў і выкладчыкаў дзвюх вышэйшых навучальных устаноў: Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера ў ГДР і Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Сумесныя навуковыя даследаванні, лекцыі, вытворчая і вучэбная практыка — вось далёка не ўвесь пералік напрамкаў узаемнага супрацоўніцтва. Штогод больш пяцідзесяці прафесараў, выкладчыкаў і студэнтаў выязджаюць у Германскую Дэмакратычную Рэспубліку, каб абмяняцца з нямецкімі сябрамі вопытам, падзяліцца назапашанымі ведамі.

У план дагавора аб дружбе і супрацоўніцтве паміж БДУ і Іенскім універсітэтам, які быў заключаны яшчэ ў 1968 годзе, уваходзяць не толькі навуковае супрацоўніцтва, вучоба, а і стварэнне інтэрнацыянальных СБА. Разам са сваімі савецкімі сябрамі нямецкія студэнты працуюць на будаўнічых пляцоўках нашай рэспублікі. Штогод студэнты-будатрадаўцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна дапамагаюць будаваць новыя аб'екты на нямецкай зямлі.

Вось ужо амаль дзесяць год запар Белдзяржуніверсітэт вядзе падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў — нямецкіх грамадзян — для работы ў шматлікіх галінах народнай гаспадаркі, на прадпрыемствах і ва ўстановах ГДР. З 1970 года і па цяперашні час было падрыхтавана 14 выпускнікоў, пяць аспірантаў абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Ва універсітэце прайшлі навуковую стажыроўку на кафедрах сем стажораў з вышэйшай адукацыяй.

Палюбілі і добра разумеюць рускую мову нямецкія сябры, таму з вялікай ахвотай вывучаюць яе на філфаку выпускнікі-стажоры, будучыя выкладчыкі рускай мовы ў ГДР.

Зараз у БДУ навучаецца 86 студэнтаў, аспірантаў і стажораў.

Нядаўна за выдатныя поспехі ў справе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, за плённую дзейнасць па ўмацаванню германа-савецкай дружбы Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна быў узнагароджаны Ганаровым знакам Таварыства германа-савецкай дружбы ў золаце.

Уручаючы Ганаровы знак, генеральны консул ГДР у Мінску С. Бернатэк цёпла павіншаваў калектыў універсітэта з узнагародай, пажадаў і надалей умацоўваць дружбу і супрацоўніцтва паміж брацкімі краінамі.

І. САВЕТКІНА,
наш кар.

АДБЫЛАСЯ справаздачна-выбарная прафсаюзная канферэнцыя супрацоўнікаў універсітэта. Са справаздачным дакладам выступіў старшыня мясцовага камітэта П. А. Дубавец. Сёння прапануем чытачам матэрыялы пастановы канферэнцыі і арганізацыйнага пасяджэння новага саставу мясцовага камітэта.

# НЕ СПЫНЯЦЦА НА ДАСЯГНУТЫМ

# ПАСТАНОВА

**прафсаюзнай канферэнцыі Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна «Аб рабоце мясцовага камітэта за справаздачны перыяд і задачах па ўдасканаленню дзейнасці прафсаюзных арганізацый у святле патрабаванняў XXV з'езда КПСС».**

ЗАСЛУХАЎШЫ і абмеркаваўшы справаздачны даклад мясцовага камітэта, канферэнцыя адзначае, што, кіруючыся рашэннямі XXV з'езда КПСС, XXVIII з'езда Кампартыі Беларусі, пастановай ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы», пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў», мясцовы камітэт, прафбюро факультэтаў і іншых падраздзяленняў універсітэта ўсе свае намаганні накіроўвалі на здзяйсненне задач, пастаўленых перад калектывам па далейшаму паляпшэнню і ўдасканаленню ўсёй сістэмы падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, павышэнню эфектыўнасці навуковых даследаванняў, ідэйна-маральнаму выхаванню студэнцкай моладзі.

Мясцовы камітэт пад кіраўніцтвам парткома, рэктарата настойліва працаваў над выкананнем прынятых сацыялістычных абавязацельстваў. Калектыў універсітэта за справаздачны перыяд дабіўся значных поспехаў у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, у выхаваўчай рабоце сярод студэнтаў, у павышэнні эфектыўнасці навуковых даследаванняў. Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за 1976 год універсітэт быў узнагароджаны пераходным Чырвоным сцягам ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ, а па выніках за 1977 год — Ганаровай граматай Мінвуза СССР і ЦК прафсаюза і другой грашовай прэміяй. За поспехі ў сацыялістычным спаборніцтве па дастойнай сустрэчы 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі універсітэт узнагароджаны вышэйшай узнагародай рэспублікі — Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

У 1978 годзе наш калектыў удастоены высокай узнагароды Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам — ордэна «Дружбы».

Мясцовы камітэт і прафсаюзныя арганізацыі факультэтаў аказвалі паўсядзённую дапамогу рэктарату, дэканатам, партыйным арганізацыям ва ўдасканаленні вучэбнага працэсу і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, што садзейнічала павышэнню паспяховасці студэнтаў, узмацненню вучэбнай і працоўнай дысцыпліны.

Вялікая ўвага ўдзялялася пытанням удасканалення методыкі выкладання, павышэнню ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню лекцый і іншых форм заняткаў. Часцей сталі праводзіцца адкрытыя лекцыі, узаемныя наведванні заняткаў і потым абмеркаванне іх. Прафесарска-выкладчыцкім саставам у 1976—1978 гадах выдадзена 120 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. У 1978 годзе выдадзена каля 300 вучэбна-метадычных распрацовак для студэнтаў усіх форм навучання.

За апошнія тры гады па даных на 1 лістапада 1979 года атрыманы 223 станоўчыя рашэнні на вынаходніцтвы, 20 медалёў ВДНГ СССР, 49 дыпломаў ВДНГ БССР. Абаронена 101 кандыдацкая дысертацыя. У 1977—1978 гадах атрымана 8 дзяржаўных і іншых прэмій. У цяперашні час штогадовы аб'ём навукова-даследчых работ складае звыш 9 мільёнаў рублёў.

Значнае месца ў рабоце мясцовага камітэта займалі пытанні аховы працы і тэхнікі бяспекі.

Ажывілася культурна-масавая і спартыўна-масавая работа. Калі ў 1977 годзе універсітэт заняў 9-е месца ў спартакіядзе «Здароўе» абласнога савета ДСТ «Буравеснік», то ў 1979 годзе — 2-е месца. За справаздачны перыяд падрыхтаваны 872 значкісты ГПА.

Разам з тым прафсаюзная канферэнцыя адзначае, што ў рабоце мясцовага камітэта мелі месца і недахопы.

З боку мясцкома і прафбюро факультэтаў слаба здзяйсняўся кантроль за размеркаваннем вучэбнай нагрузкі. Недастаткова ўдзялялася ўвагі павышэнню працоўнай дысцыпліны, праверцы выканання прымаемых рашэнняў. Не на ўзроўні справа і з арганізацыяй грамадскага харчавання. Мясцовы камітэт не заўсёды здзяйсняў своечасовы кантроль за ходам выканання сваіх рашэнняў, недастаткова яшчэ ўдзяляў увагі абагульненню і распаўсюджанню передавога вопыту работы лепшых прафсаюзных бюро і груп.

Ва універсітэце да цяперашняга часу не створана агульнауніверсітэцкая Дошка гонару, не аформлена Кніга працоўнай славы і Кніга гонару універсітэта.

Справаздачна - выбарная прафсаюзная канферэнцыя пастанаўляе:

1. Работу мясцовага камітэта за перыяд з 4 лістапада 1976 года па 21 лістапада 1979 года прызнаць здавальняючай.

2. Унову выбранаму мясцоваму камітэту ў сваёй дзейнасці ўвесь час кіравацца рашэннямі XXV з'езда КПСС, XXVIII з'езда Кампартыі Беларусі і іншых пастаноў партыі і ўрада.

Сістэматычна праводзіць работу па павышэнню ўзроўню арганізацыі і дзейнасці сацыялістычнага спаборніцтва, дабівацца яго шырокай галоснасці і эфектыўнасці.

Вынікі сацыялістычнага спаборніцтва сістэматычна адлюстроўваць на агульнауніверсітэцкай Дошцы гонару і ў Кнізе працоўнай славы універсітэта.

3. Мясцоваму камітэту універсітэта, прафсаюзным бюро факультэтаў, агульнауніверсітэцкіх кафедраў і іншых падраздзяленняў актывізаваць вытворчую работу. Сістэматычна здзяйсняць кантроль за размеркаваннем і выкананнем вучэбнай нагрузкі; садзейнічаць больш актыўнаму ўкараненню ў вучэбны працэс ТСН і праграміраваных метадаў навучання. Павысіць узровень вытворчых нарад, на якіх разглядаць пытанні павышэння якасці і эфектыўнасці вучэбнага працэсу.

4. Мясцоваму камітэту, прафсаюзным бюро звярнуць асаблівую ўвагу на павышэнне эфектыўнасці навуковых даследаванняў ва універсітэце, канцэнтрацыі сродкаў і намаганняў навукова-педагагічнага саставу на выкананне тэм па важнейшай тэматыцы; дабівацца найбольш поўнага выкарыстання навуковага патэнцыялу кафедраў, факультэтаў і навукова-даследчых падраздзяленняў універсітэта.

5. Павысіць эфектыўнасць выхаваўчай работы сярод прафесарска-выкладчыцкага саставу, студэнтаў універсітэта; пастаянна ўдасканальваць яе формы і метады, дабівацца павышэння грамадска-палітычнай актыўнасці супрацоўнікаў універсітэта. Сістэматычна абмяркоўваць на пасяджэннях мясцовага камітэта пытанні ідэйна-выхаваўчай работы.

6. Больш настойліва і мэтанакіравана дабівацца паляпшэння ўмоў працы прафесарска-выкладчыцкага саставу. Забяспечыць пастаянны кантроль за падтрыманнем у аўдыторыях, на кафедрах і ў лабараторыях добрай асвятляльнасці, за належнай работай сістэмы вентыляцыі, абагрэву памяшканняў у зімовы перыяд. Узмацніць свой уплыў на паскарэнне работ па абсталяванню паточных аўдыторый (радыёфікацыя, дошкі і іншая неабходная мэбля), а таксама пакояў адпачынку для выкладчыкаў на факультэтах.

7. Актывізаваць работу камісіі па грамадскаму харчаванню, дабівацца паляпшэння работы сталовых і буфетаў у вучэбных карпусах і інтэрнатах.

8. Мясцоваму камітэту звярнуць асаблівую ўвагу на пытанні паляпшэння жыллёвых умоў выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта, паляпшэння стану іх быту і адпачынку. З гэтай мэтай дабівацца паскарэння будаўніцтва жылога дома. Сумесна з рэктаратам хадайнічаць перад дырэктыўнымі органамі аб выдзяленні сродкаў на будаўніцтва дзіцячага камбіната, пансіяната для супрацоўнікаў універсітэта на возеры Нарач і прафілакторыя паблізу Мінска.

9. Хадайнічаць перад рэктаратам аб магчымасці выкарыстання ў чэрвені студэнцкага спартыўна-аздараўленчага лагера на возеры Нарач для адпачынку супрацоўнікаў універсітэта, а таксама аб пабудове летняй кухні для адпачываючых у палатках. Адрамантаваць і абсталяваць неабходнай мэбляй два дамы, якія выдзелены для мясцовага камітэта.

10. Абавязаць мясцком, прафсаюзныя бюро прыняць меры па паляпшэнню арганізацыі здачы норм ГПА супрацоўнікамі універсітэта, прыцягненню выкладчыкаў, рабочых і служачых у спартыўныя секцыі і групы здароўя.

Ажыццявіць неабходныя меры па паляпшэнню работы гурткоў мастацкай самадзейнасці і прыцягненню ў іх выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў, рабочых і служачых універсітэта.

11. Пастаянна павышаць узровень арганізацыйнай работы, сістэматычна абагульняць вопыт работы лепшых прафсаюзных бюро і груп, своечасова прапагандаваць яго. Дабівацца выканання рашэнняў мясцовага камітэта.

12. Мясцоваму камітэту сістэматычна інфармаваць нізавыя прафсаюзныя арганізацыі аб прынятых рашэннях, запрашаць прадстаўнікоў прафбюро на свае пасяджэнні.

13. Унову выбранаму мясцоваму камітэту прааналізаваць крытычныя заўвагі і прапановы, выказаныя на справаздачна-выбарнай універсітэцкай канферэнцыі, а таксама на справаздачна-выбарных прафсаюзных сходах падраздзяленняў універсітэта, распрацаваць план іх рэалізацыі і далажыць яго ў студзені на сходзе актыву пры падвядзенні вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва за 1979 год. Рэгулярна інфармаваць членаў прафсаюза праз шматыражную газету «Беларускі універсітэт» і насценны друк аб ходзе выканання крытычных заўваг, а таксама аб выкананні рашэнняў, прымаемых мясцкомам універсітэта і вышэйстаячымі органамі.

14. Справаздачна - выбарная прафсаюзная канферэнцыя Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна выражае ўпэўненасць у тым, што прафесарска-выкладчыцкі састаў, супрацоўнікі паспяхова выканаюць задачы, пастаўленыя перад вышэйшымі навуковымі установамі XXV з'ездам КПСС, XXVIII з'ездам Кампартыі Беларусі, XVI з'ездам прафесіянальных саюзаў нашай краіны.

# Размеркаваны абавязкі

**На арганізацыйным пасяджэнні мясцовага камітэта размеркаваны абавязкі:**

Э. В. Шастаковіч — старшыня мясцкома, дацэнт кафедры палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў, член прэзідыума;
У. І. Сілін — намеснік старшыні мясцкома, член прэзідыума.

### АРГАНІЗАЦЫЙНА-МАСАВАЯ КАМІСІЯ

У. І. Сілін — старшыня камісіі, член прэзідыума;

В. І. Яйсо — кіраўнік педагагічнай пратыкі;

Я. А. Свірскі — старшы інжынер ВЦ;

У. Т. Шалатонін — дацэнт біяфака.

### ВЫТВОРЧА-МАСАВАЯ КАМІСІЯ

І. П. Казлоў — старшыня камісіі, старшы выкладчык фізфака, член прэзідыума;
У. С. Багданаў — прарэктар;
П. А. Дубавец — дацэнт юрфака, член прэзідыума;
А. А. Калупаеў—старшы навуковы супрацоўнік СКТБ;
І. С. Манак — асістэнт факультэта радыёфізікі і электронікі;
П. П. Шуба — прафесар філфака.

### ЖЫЛЛЁВА-БЫТАВАЯ КАМІСІЯ

Ф. В. Чумакоў — старшыня камісіі, дацэнт мехмата, член прэзідыума;
Ю. А. Гусеў — дацэнт кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў, член прэзідыума;

Л. А. Ісачанкава — дацэнт фізфака, член прэзідыума;
Л. С. Станішэўскі — прафесар хімфака;

А. Г. Слука — загадчык падрыхтоўчага аддзялення, член прэзідыума.

### КУЛЬТУРНА-МАСАВАЯ КАМІСІЯ

Г. І. Марцінкевіч — старшыня камісіі, дацэнт геафака, член прэзідыума;
В. К. Васілеўская — старшы выкладчык падрыхтоўчага факультэта;
Р. І. Пустаход — намеснік дырэктара бібліятэкі;
К. І. Восіпаў — дацэнт гістфака.

### СПАРТЫЎНА-МАСАВАЯ КАМІСІЯ

С. У. Макарэвіч — старшыня камісіі, старшы выкладчык кафедры фізвыхавання, член прэзідыума;
Л. М. Аўсянка — дацэнт хімфака.

### КАМІСІЯ ПА АХОВЕ ПРАЦЫ

П. М. Гапонік — старшыня камісіі, старшы навуковы супрацоўнік НДІ ФХП, член прэзідыума;
А. І. Баранаў — электрамантажнік СКТБ.

### КАМІСІЯ ДЗЯРЖСТРАХУ

Э. В. Шастаковіч — старшыня камісіі, дацэнт кафедры палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў, член прэзідыума;
М. М. Піпчанка — намеснік дэкана філфака;
В. Ф. Якушка — прафесар геафака.

### КАМІСІЯ ГРАМАДСКАГА ХАРЧАВАННЯ

М. І. Юрчук — старшыня камісіі, дацэнт ФПМ, член прэзідыума;
С. М. Касячэнка — начальнік тэхнічна - эксперыментальнага аддзела;
С. М. Грабчыкаў — дацэнт журфака.

### КАМІСІЯ ДАПАМОГІ СЯМ'І І ШКОЛЕ

С. В. Лузгіна — старшыня камісіі, загадчык кафедры англійскай мовы.

### ГРАМАДСКА-ЮРЫДЫЧНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ

І. І. Марціновіч — старшыня камісіі, прафесар юрфака.

ЧАСТА можна ўбачыць студэнтаў юрыдычнага факультэта нашага універсітэта ў класах, залах, на спартыўных пляцоўках сярэдняй школы № 105 горада Мінска. Галоўная задача будучых юрыстаў — дапамагчы падлеткам знайсці сваё месца ў жыцці.

Вось што расказала Надзея Маліноўская — адказная за шэфскі сектар камітэта камсамола юрыдычнага факультэта.

МЫ — ШЭФЫ

# Мацаваць сувязі

— Нашы хлопцы і дзяўчаты сталі вернымі сябрамі вучняў чацвёртых і сёмых класаў. Сабрацца разам у спортзале і пагуляць з рабятамі ў валейбол, футбол стала ў нас добрай справай.

Нашы студэнты заўсёды дапамогуць правесці палітінфармацыю, піянерскі збор, віктарыну. Шмат слухачоў прыходзіць і на лекцыі, якія мы рыхтуем. Шэфамі вучняў гэтай школы мы з'яўляемся два гады. Ёсць некаторыя цяжкасці ў нашай рабоце, бо няма яшчэ патрэбнага вопыту, усё прыходзіцца рабіць самастойна, без чыіх-небудзь падказак. Не маглі «падзяліць» мы сваіх выхаванцаў са студэнтамі педагагічнага інстытута. Але зараз праца ідзе добра, дапамагаюць нам педагогі школы. І вельмі радасна, калі бачыш, што твой падшэфны стараецца прынесці нейкую карысць свайму калектыву.

Цяпер шэфская група юрыдычнага факультэта з'яўляецца лепшай сярод шэфскіх груп універсітэта. І хочацца думаць, што сувязь паміж вучнямі сто пятай школы і студэнтамі юрыдычнага факультэта будзе мацнець з кожным днём. Хто ведае, можа праз некалькі год былы падшэфны прыйдзе вераснёўскім ранкам у сваю родную школу і скажа: «Я — студэнт юрфака БДУ імя У. І. Леніна».

А. ВАРАХОБКА.
(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).

# ТВОЙ ПЕРШЫ КРОК

ФОТАРЭПАРТАЖ





Школа. Твой першы ўрок. Як яго правесці? Як заваяваць аўтарытэт і прывіць цікавасць да геаграфіі? Якія прывесці прыклады і выкарыстаць параўнанні?

Ты разумееш, што асноўная форма навучання — гэта ўрок. І табе, як нікому іншаму, трэба клапаціцца аб тым, каб ён прайшоў цікава, каб не было нічога лішняга, поўна быў выкарыстаны час.

Вядома, да таго, пакуль ты зойдзеш у клас, старэйшыя педагогі могуць параіць, што трэба любіць геаграфію. Дарыць дзецям радасць першаадкрыццяў, расказваць пра нялёгкія будні геолагаў і адкрыццё белых плям на карце. Што на першым жа ўроку трэба паказаць свае адносіны да навукі.



І вось ты заходзіш у клас. Не губляйся. Паглядзі. Ён усхваляваны, абрадаваны ці проста ўзбудараваны... Не хавай ад іх свае перажыванні. Яны зразумеюць цябе. І ты іх...

Фота Д. Паўлава.

КАЛЕКТЫЎ: ПРАБЛЕМА СТАНАЎЛЕННЯ

# ДЗЕ ЯНА, «ЗАЛАТАЯ СЯРЭДЗІНА»?

НА ФПМ я прыйшла ўпершыню. Можа таму так уразіў гэты факт: 89 студэнтаў здалі апошнюю сесію з двойкамі, больш як 30 чалавек выключаны з факультэта за апошні год. Калі ж параўнаць з мінулагоднім, то працэнт паспяховасці павысіўся. І ў гэтым вялікая заслуга партыйнай, камсамольскай, прафсаюзнай арганізацый, дэканата і саміх студэнтаў. Але, я думаю, лічба 93,4 працэнта нікога з іх не задавальняе, і не сумняваюся, што студэнты і далей будуць змагацца за паляпшэнне паспяховасці. Вось цікавыя лічбы: з 1430 студэнтаў ФПМ 600 скончылі школу з медалём, большасць астатніх — без чацвёрак. Адкуль жа гэтыя 89 нездавальняючых адзнак, адкуль адно з апошніх месц па паспяховасці ва універсітэце? Цяжкі факультэт? Так. Але ж некаторыя і зараз вучацца толькі на выдатна. Атэстаты ж, як бачым, не вельмі адрозніваюцца адзін ад аднаго. Ва ўсякім разе, зусім не так, як пяцёрка і двойка. У чым жа справа? Толькі ў асабістых якасцях студэнтаў? А можа ўсё ж такі нейкі ўплыў тут аказвае група? І наогул: як уплывае група, яе калектыў на жыццё студэнтаў? Сапраўды, цікава.

Паспрабуем даведацца. Адной разабрацца ў гэтым немагчыма, а таму вывады і адказы на пытанні давайце шукаць разам.

Знаёмцеся: трэці курс, 10-я група. Размаўляю з прафоргам Галінай Кандрацьевай. Першае пытанне наўздагад: «Ці дружная ў вас група?». Не зусім упэўнена Галя адказвае: «У звычайным сэнсе слова — не вельмі». «У звычайным сэнсе» дружнай лічыцца група, якая часта збіраецца разам, сумесна праводзіць вольны час. У 10-й групе калектыў склаўся іншы. Відаць, Галя і сама шмат думала пра гэта, таму размаўляць нам было лёгка.

Па-першае, палова групы — медалісты. 7 чалавек і зараз вучацца на выдатна, многія — без троек. Па паспяховасці група займае адно з першых месц. 11 чалавек займаюцца ў СНДЛ — студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі, выконваюць вытворчыя заданні. Я б яшчэ дадала, што для гэтай групы характэрна своеасаблівая арыентацыя ўсяго студэнцкага жыцця, усёй дзейнасці на авалоданне будучай спецыяльнасцю, прафесійная накіраванасць справу. Добра гэта ці не? Думаю, нядрэнна. Пытанне ў іншым: дапамагае гэта ці перашкаджае групе стаць калектывам?

Галя гаворыць, што тыя адзінаццаць чалавек, якія займаюцца ў СНДЛ, часцей сустракаюцца адзін з адным і па-за сценамі універсітэта. І гэта заканамерна: разам больш цікава, агульныя праблемы, захапленні, праца. Але не спяшайцеся папракаць іх у «адарванасці ад калектыву».

Цікавы факт: у 10-й групе не спісваюць. Не таму, што не даюць, а таму, што не хочуць такой «дапамогі» самі студэнты. Што гэта: гонар ці нешта іншае? Тое, што завуць перакананнямі?

І яшчэ. Галя, як я гаварыла, сама не ўпэўнена, ці можна лічыць яе групу дружнай. Але як жа тады растлумачыць той факт, што ў час экзаменаў група не разыходзіцца, пакуль не здасць экзамен апошні студэнт? Што, калі хтосьці пайшоў дадому раней, ён абавязкова звоніць потым таварышам і пытаецца аб выніках? Задумайцеся: кожнаму цікава, як здалі экзамен усе яго таварышы. Факт гэты вельмі, мне здаецца, красамоўны. Ніхто не абвінавачыць, калі пойдзеш дадому раней—заўсёды ж можна спаслацца на справы. Аднак усе чакаюць да канца. Значыць, не такія ўсё ж яны «індывідуалісты», гэтая 10-я група. Значыць, «хварэюць» адзін за аднаго па-сапраўднаму...

Гэту тэму, дарэчы, і падказала мне Галя. Расказаўшы аб тым, як добра было на апошняй «бульбе», як дружна жылі там студэнты, як не хацелася ехаць адтуль, яна раптам сказала: «А вы цяпер пагаварыце з кім-небудзь з іншай групы. Напрыклад, вось з тым хлопцам: ён таксама на трэцім курсе, але іх група — зусім іншая. Яны заўсёды разам, яны жывуць весялей». І дадала: «Мы ім зайздросцім часам...» — «Зайдросціце?» — здзівілася я. — «Так. Але ў нас так не атрымліваецца, мы спрабавалі. Не ведаю, чым гэта растлумачыць — можа часу не хапае...»

Ліпай Валодзя (той самы хлопец, з якім параіла мне пазнаёміцца Галя) аб сваёй групе гаварыў з ахвотай, з задавальненнем. Так, група № 2 — цудоўная група, вельмі дружная. Разам адпачываюць, ходзяць на экскурсіі... Валодзя папрасіў, каб я абавязкова напісала аб дзяўчатах з культмасавай камісіі групы — Але Казловай і Алe Дурновай. Кожны раз здзіўляецца група, як яны паспяваюць купляць білеты на самыя цікавыя спектаклі і канцэрты. «Яшчэ што?— успамінае Валодзя.— Яшчэ мы часта арганізуем вечары адпачынку. Імяніннікаў таксама віншуе ўся група». Пытаюся пра вучобу — Валодзя ўсміхаецца трошкі сарамліва: «Ну, у вучобе нашы крыху слабей, падленьваліся». Як гаворыцца, не ў брыво, а ў вока. «Валодзя,— пытаюся,— а як вы збіраецеся далей вучыцца?» Адказвае сур'ёзна: «Мы вырашылі з гэтым скончыць. Жарты-жартамі, але сяго-таго паўшчувалі па-сапраўднаму. Па-таварыску, але строга». Пытаюся: «Як ты думаеш, што галоўнае ў вашым жыцці — вучоба ці ўсё астатняе? Чым павінны запомніцца студэнцкія гады: вучобай, навуковай працай ці вось гэтымі гадзінамі, праведзенымі разам,— гадзінамі, якія, па сабе ведаю, вельмі дарагія для кожнага студэнта?» — Валодзя зразумеў мяне. Задумаўся: «Не ведаю. Але адной вучобы недастаткова, упэўнены».

Хтосьці спытае: а навошта пісаць пра ўсё гэта? Падабаецца адным у вольны час займацца ў СНДЛ — і добра. Падабаецца іншым жыць па-свойму — гэта іх асабістая справа. Усё так. Але я памятаю няўпэўнены Галін голас — нібы шукае чалавек адказ і не знаходзіць, памятаю і гэта яе апошняе: «Зайздросцім...». І Валодзю хочацца, сам ён казаў, каб група яго вучылася лепш. Відаць, у чымсьці і ён зайздросціць Галі і яе сябрам. Зрэшты, і з 2-й групы некалькі чалавек займаюцца ў СНДЛ.

І, апрача таго, 10-я і 2-я групы вельмі адрозніваюцца па адзнаках, а гэта ўжо справа не толькі іх адных...

Ну вось і ўсё. «Інфармацыя да роздуму», так сказаць. Калі хто захоча ведаць пункт гледжання аўтара, то ён у назве. Мне здаецца, што не ўсе згодзяцца з такой пастаноўкай пытання. І, вядома, цікава даведацца, што ж думаюць астатнія.

Адказ патрэбен. Патрэбен Галі, Валодзю, нам усім — і тым, хто заканчвае БДУ, і тым, для каго ўсё яшчэ наперадзе. І невядома яшчэ, каму ён патрэбен болей...

В. ЕФІМЕНКА,
студэнтка журфака.
(Прэс-цэнтр прафкома).

**Ад рэдакцыі:**

**Аўтар узнімае шэраг праблем станаўлення студэнцкага калектыву. На прыкладзе дзвюх груп факультэта прыкладной матэматыкі паказвае, што студэнцкі калектыў — гэта не толькі часовае аб'яднанне на лекцыях і семінарскіх занятках...**

**Актуальнасць тэмы асабліва ўзрастае ў святле нядаўняй пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы». Вось чаму рэдакцыя звяртаецца да цябе, паважаны чытач, прыняць удзел у дыскусіі «Калектыў: праблема станаўлення». Раскажыце аб жыцці сваіх груп. Падумайце, ці дружная група ў вас. Што патрэбна зрабіць, каб склаўся моцны калектыў і пяць студэнцкіх гадоў запомніліся вам на ўсё жыццё!**

**Магчыма, не ўсе меркаванні аўтара для вас будуць бясспрэчныя, вы не поўнасцю будзеце згодны з яго пунктам гледжання. Паразважайце.**

**Слова табе, чытач!**

# Зіма спытае

АДБЫЛОСЯ расшыранае пасяджэнне групы народнага кантролю БДУ імя У. І. Леніна, на якім былі абмеркаваны вынікі праверак гатоўнасці вучэбных карпусоў, вытворчых памяшканняў і інтэрнатаў да работы ў зімовых умовах 1979-80 навучальнага года.

Большасць карпусоў амаль поўнасцю падрыхтаваны да зімы: уцеплены вітражы, заклеены вокны, праведзены рамонт абсталявання і мэблі, праверана работа ацяпляльнай сістэмы. Але не ўсюды зроблена ўсё магчымае для нармальнай работы, вучобы і жыцця супрацоўнікаў і студэнтаў. Так, шмат недахопаў выяўлена на геаграфічным факультэце: не засцеклены дах над аранжарэяй, у некаторых аўдыторыях працякае вада, патрабуецца тэрміновы рамонт аконных рам, дзвярэй, дрэнна грэюць батарэі. У памяшканнях філалагічнага факультэта патрэбна тэрмінова правесці каналізацыйныя работы; шмат недаробак у корпусе, дзе размясціўся зараз юрыдычны факультэт. У некаторых інтэрнатах ёсць неадрамантаваныя аконныя рамы, выбіта шкло. Дырэкцыяй студгарадка распрацаваны план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы інтэрнатаў да зімы.

Правёўшы праверку стану падрыхтоўкі памяшканняў, вучэбных карпусоў і інтэрнатаў да зімовых умоў, ГНК і мясцком БДУ імя У. І. Леніна рэкамендуюць распрацаваць ва ўсіх падраздзяленнях універсітэта план мерапрыемстваў па выкананню пастановы Савета Міністраў СССР ад 7 чэрвеня 1979 года «Аб мерах па скарачэнню страт цяпла ў пабудовах жыллёва-грамадзянскага і вытворчага назначэння і цеплавых сетак».

В. АНДРЭЕЎ,
наш кар.

НА ТЭМЫ МАРАЛІ

# Урок на будучае

**«ВЫКЛЮЧЫЦЬ С. В. Каралёва, С. А. Карнавухава, М. Г. Смятанку з ліку студэнтаў 2-га курса факультэта радыёфізікі і электронікі за недастойныя паводзіны, якія выразіліся ў п'янцы і хуліганскіх дзеяннях».**

Кароткі тэкст загаду. Здаецца, усё проста і зразумела. Але незразумела толькі адно, чаму гэта здарылася? Што прымусіла іх, студэнтаў-другакурснікаў, пайсці на такі ўчынак? Чаго не хапала ім, васемнаццацігадовым юнакам, у лістападаўскі вечар?

Напэўна, толькі цяпер, калі прайшлі ўсе інстанцыі, пачынаючы з групы і заканчваючы рэктаратам, яны аналізуюць кожны свой крок, кожную сваю думку ў той вечар? Гэта цяпер...

А тады было куды прасцей...

— Мікалай! Гэта ён, я яго пазнаў. Памятаеш, мяне «пабілі» ў Барысаве, на станцыі. Цяпер прыйшоў час разлічыцца з ім... Дзе Сярожа? — ліхаманкава нашэптваў С. Каралёў. Хвіліна, і трое «сяброў» накіроўваюцца на вуліцу.

...Доўга не разбіраліся. Навошта... Білі ўтрох. У жывот, спіну, куды папала. Білі, ні ў чым не вінаватага студэнта. Такога ж, як яны самі. Білі і не памяталі пра тое, што яны людзі, камсамольцы, студэнты...

Помста закрывала ім вочы. Сляпая помста, нізкая, агідная. Якую нічым нельга апраўдаць. Падкрэслю, нічым.

Пасля адзін з іх, М. Смятанка, у тлумачэнні напіша: «Віну сваю прызнаю». Абодва другіх з цяжкасцю асэнсуюць свой брыдкі ўчынак. З тлумачальнай запіскі С. Каралёва: «...аднаго з хлопцаў я выпадкова зачапіў. Войту, магчыма, было нанесена цялеснае пашкоджанне...» Цяжка каменціраваць такую адпіску. Пасля ўсяго, што здарылася, ён не здолеў знайсці смеласці нават прызнацца самому сабе. Адкуль такая чэрствасць душы?

У той час яны не думалі, што ёсць калектыў, група, што яны з'яўляюцца студэнтамі, што яны камсамольцы...

Не адзін раз бацькі ганарыліся сваімі сынамі, радаваліся іх поспехам, жадалі, каб яны атрымалі вышэйшую адукацыю. І для гэтага былі ўсе магчымасці. А яны? Яны адным сваім крокам перакрэслілі ўсё гэта.

...Усе мы ведаем сяброўскую дружбу, але на гэты раз яна аказалася дробязнай. Трое супраць аднаго. Да таго ж, ні ў чым не вінаватага хлопца. Бо гэта «тройка» прыняла яго за зусім іншага.

На камсамольскім сходзе групы, пасля доўгай размовы, рашэнне было адным — «Выключыць з радоў ВЛКСМ і хадайнічаць перад дэканатам аб выключэнні іх з ліку студэнтаў універсітэта».

Потым было яшчэ многа пасяджэнняў: камітэта камсамола, дэканата, партыйнага бюро, на якіх дасканала разбіраўся ўчынак Каралёва, Карнавухава, Смятанкі.

Грамадскія арганізацыі з усёй сур'ёзнасцю разабраліся ў надзвычайным здарэнні і прыйшлі да адзінага — такі ўчынак несумяшчальны са званнем камсамольца, студэнта ВНУ. Рэктарат падтрымаў рашэнне грамадскіх арганізацый.

...Цяпер яны — «былыя студэнты». Вяртанне ў студэнцкую сям'ю залежыць поўнасцю ад іх саміх. Ад таго, як яны асэнсуюць даны ўрок. А гэта пакажа час...

**В. ШАЎЧУК,**
**наш кар.**

● СУСТРЭЧЫ ДЛЯ ВАС

# БЫЦЬ САМІМ САБОЙ



СУСТРЭЧА з мастацтвам заўсёды свята. Няхай нябачнае, неадзначаемае — проста свята ў душы. І калі прачытаеш цікавую кнігу, паглядзіш цудоўны спектакль ці кінафільм, у цябе застаецца часцінка таго сапраўднага, што ўдалося паказаць аўтару і ў што ты бясспрэчна паверыў.

Такой сілай пераканання валодае малады таленавіты рэжысёр і акцёр Мікіта Міхалкоў. Яго фільмы прымушаюць думаць, адкрываюць таямнічы свет чалавечай душы.

— Для мяне кіно — жаданне даведацца аб самім сабе. Гэта нават не работа, гэта—маё жыццё, — сказаў на нядаўняй сустрэчы са студэнтамі універсітэта М. Міхалкоў. — Мне часта задаюць пытанне: ці абавязкова фільм павінен нечаму вучыць? Я так не лічу. Думаю, твор ужо каштоўны сам па сабе тым, што ставіць пытанне, а пытанне — гэта рух наперад, яно заўсёды выклікае роздум.

Яго фільмы нікога не пакідаюць абыякавымі. Успомніце «Пяць вечароў» па п'есе А. Уладзімірава, дзе галоўны герой, ідучы цераз уласныя перажыванні, цераз імкненне схавацца ад самога сябе, нарэшце перадольвае жаданне здавацца кімсьці. А гэта вельмі нялёгка.

— Жаданне не быць самім сабой, кімсьці здавацца — гэты матыў праходзіць амаль праз усе мае фільмы. І я імкнуся разбіць гэту спробу адарвацца ад прыроды, ад самога сябе, ад сутнасці. Заўважце, па-сапраўднаму шчаслівыя людзі — Сашанька і невялікі хлопчык з «Незакончанай п'есы для механічнага піяніна». Яны такія, як ёсць, з іх чыстай і даверлівай душой.

Першакласным, сапраўды рускім назваў гэты фільм паэт Я. Еўтушэнка. І нездарма гэтая тонкая і разумная карціна атрымала галоўны прыз—«Вялікую залатую ракавіну» на XXV Міжнародным кінафестывалі ў Сан-Себасцьяне. Па сутнасці гэта імправізацыя на тэмы Чэхава.

— Для мяне Чэхаў, — гаворыць М. Міхалкоў, — непадзельны на Антошу Чэхантэ і А. П. Чэхава, умудронага вопытам. Ён адзіны, цэлы. «Незаконченая п'еса для механічнага піяніна» — гэта спроба аб'яднаць чэхаўскую лёгкасць пачатку жыцця з глыбінёй, сталасцю канца. Экранізацыю творчасці класікаў я ні ў якой меры не лічу «лікбезам». Гэта своеасаблівы пункт гледжання сучаснага чалавека на тыя з'явы, якія хвалявалі класіка. Напрыклад, у новым маім фільме па раману І. Ганчарова «Абломаў» я хацеў парушыць закаранелыя адносіны да Абломава як лежабокі, супаставіць дабро і зло, разгледзець галоўнага героя з пазіцыі чалавека, які нікому не рабіў дрэннага.

Гэтыя тэмы любві, пошуку сябе, веры, адраджэння ў той ці іншай меры прысутнічаюць ва ўсіх кінаработах рэжысёра. Няхай былі промахі і недахопы ў ранніх фільмах, М. Міхалкоў не хацеў бы іх перарабляваць. Для станаўлення майстра парушэнне гармоніі развіцця з яго памылкамі, іх выпраўленнем недапушчальна. Толькі так і прыходзіць сапраўдная сталасць.

Зараз М. Міхалкоў разам з пастаяннымі сааўтарамі — сцэнарыстам В. Мярэжкам, мастаком А. Адабаш'янам пачалі працаваць над новым фільмам «Была не была». Верыцца, што і гэты фільм, як шмат іншых, якія, несумненна, яшчэ будуць створаны маладым рэжысёрам, спадабаюцца гледачу.

**С. ІВАНОВА,**
**наш кар.**

**На здымку: М. Міхалкоў і В. Мярэжка** на сустрэчы ў БДУ імя У. І. Леніна.

Фота **М. Дубовіка.**







**Не бойся, з'еш кавалачак...**

Фота **Т. Сахашчык.**

***

**Сярожка.**



# Свята першакурснікаў

ВОСЬ і прыйшоў той незвычайны дзень. Першакурснікі, яшчэ зусім нядаўна трымаўшыя ўступныя экзамены, пасвячаюцца ў дружную студэнцкую сям'ю.

...Пад урачысты барабанны пошчак на сцэне нечакана паяўляюцца Вярхоўны жрэц і каралева Заліковая кніжка. Яны цёпла віншуюць першакурснікаў, жадаюць ім поспехаў у вучобе. «Дзяржаўнай» пячаткай замацоўваецца «Указ аб пасвячэнні».

«На зямлі і на вадзе адчуваць сябе студэнтамі геафака. Вучыцца толькі на выдатна і добра. Паважаць сваіх настаўнікаў. Адправіцца ў тайгу, пустыню, прайсці праз палярныя льды, калі гэтага будзе патрабаваць навука», — даюць клятву першакурснікі.

Потым дэкан факультэта завярае подпісам Студэнцкі Білет І курса.

Пачынаецца святочны канцэрт. У ім прымаюць удзел спевакі, танцоры і фокуснікі.

Смех і ажыўленне ў зале выклікалі пародыі А. Іванова ў выкананні Святланы Сакалоўскай, «Парады першакурснікам» Аляксандра Аксёнкі.

Нікога не пакінуў абыякавым эмацыянальны танец Марыны Кракавай — інсцэніроўка песні У. Мулявіна «Крык птушкі»... Апладысментамі ўзнагароджваюць выканаўцу ўдзячныя гледачы.

Затаіўшы дыханне, усе слухалі песні І. Варажбянінава, здзіўляліся майстэрству фокусніка Сяргея Кудзіна. Але асабліва парадаваў студэнтаў тэатр мініяцюр. В. Грозаў, А. Нікалаёнак, Н. Ратомскі, В. Гарбачоў паказалі гледачам некаторыя моманты з жыцця факультэта.

**В. ВОБЛІКАВА,**
**А. ВЕРСТАВА.**
**(Прэс-цэнтр прафкома).**


Беларускі універсітэт

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

6 снежня 1979 г.
Заказ № 1961. АТ 10952.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 22-07-19

В. а. рэдактара

В. П. ВАРАБ'ЁЎ.